

# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

*П. А. КАРАЛЁЎ*

## АХОВА ПОМНІКАЎ АРХІТЭКТУРЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

*Паказана дзейнасць Пецярбургскай імператарскай археалагічнай камісіі, Расійскай акадэміі мастацтваў, Маскоўскага імператарскага археалагічнага таварыства, Рускага геаграфічнага таварыства і іншых па ахове помнікаў архітэктуры на тэрыторыі Беларусі ў вызначаны перыяд.*

*Прааналізавана таксама дзейнасць Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, якая працавала непасрэдна на тэрыторыі Беларусі, некаторых дзяржаўных устаноў Расійскай імперыі па ахове архітэктуры на тэрыторыі Беларусі, іх праблемы, поспехі і вынікі.*

*Гэты аналіз дапамагае стварыць карціну па вывучэнні вопыту аховы архітэктурнай спадчыны Беларусі, што можа быць выкарыстана ва ўмовах сучаснай палітыкі Рэспублікі Беларусь у галіне культуры.*

Вывучэнне дзейнасці дзяржаўных устаноў і таварystваў па ахове помнікаў архітэктуры на тэрыторыі Беларусі падчас знаходжання яе ў складзе Расійскай імперыі адлюстравана ў шэрагу навуковых прац сучасных беларускіх аўтараў. Сярод іх працы Л. В. Аляксеева “Археология и краеведение Беларуси XVI в., 30-е годы XX в.” [1], А. М. Кулагіна [7], А. І. Лакоткі “Архитектурное наследие Беларуси: развитие традиций, охрана и реставрация” [9], М. А. Ткачова [16]. Найбольш поўна раскрыў гэту тэму беларускі даследчык Л. М. Несцярчук у сваёй працы “Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі” [11]. З рускіх даследчыкаў, якія вывучалі дзейнасць арганізацый па ахове архітэктурных помнікаў, мы вылучаем І. І. Камарову [5].

Акрамя таго, дзейнасць гарадскіх улад па ахове архітэктуры гарадоў ад пажараў была прааналізавана на аснове перыядычнага друку XIX і пачатку XX ст., дзе вялікае месца займае інфармацыя аб прычынах і выніках пажараў, падчас якіх часта цярпелі вартыя ўвагі аб’екты архітэктуры (напрыклад, рэдакцыі газет “Мінскія ведамасці” [4], [12], [13], “Віцебскія губернскія ведамасці” [10] і інш.).

Тым не менш, нягледзячы на каштоўнасць дадзеных публікацый, адсутнічае цэласная карціна работы камісій і дзяржаўных устаноў па ахове помнікаў архітэктуры.

Пачынаючы з 1772 г., калі ўсходнія абшары Рэчы Паспалітай адышлі да Расійскай імперыі, паступова пачынаецца працэс адаптацыі новых далучаных тэрыторый у межах імперыі. Таму з 1773 г. Расійскай акадэміяй навук на землі Беларусі накіроўваліся экспедыцыі. Мэта іх была больш азнаямляльная, разам з тым адзначаўся і стан захавання гістарычных помнікаў. У гэты час, на жаль, не былі вызначаны тыя ведамствы і арганізацыі, якія адказвалі за ахову архітэктурнай спадчыны ў межах імперыі. Звязана гэта не толькі з тым, што Расія пачынала знаёміцца з новымі тэрыторыямі, а і з тым, што сама праблема аховы помнікаў не была развіта на той час, хоць шматлікія еўрапейскія краіны ўжо рабілі значныя поспехі ў справе рэстаўрацыі і кансервацыі.

Упершыню ў Расіі ўвага на стан захавання помнікаў архітэктуры пасля далучэння тэрыторыі Беларусі звяртаецца ў 20–30-я гг. XIX ст. Трэба ўлічваць, што дзейнасць у дачыненні помнікаў архітэктуры Беларусі адпавядала той палітыцы кіруючых колаў, што вызначалася патрабаваннямі часу і ідэалагічнымі мэтамі царскай улады. На той час пашыраліся палітыка русіфікацыі і праваслаўе. Таму найбольш яскрава стан аховы помнікаў архітэктуры праявіўся на прыкладзе культавых будынкаў (цэркваў, касцёлаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

31 снежня 1826 г. выходзіць указ Мікалая І “О доставлении сведений об остатках древних зданий в городах и запрещении разрушать оныя” [9, с.174]. Урад імкнуўся паказаць, што клапоціцца аб захаванні старажытных помнікаў. “Остановитесь! И не смейте более прикасаться к древностям!” – так выказваўся ў 1831 г. імператар Мікалай І у Наўгародскай Сафіі, калі пабачыў мастакоў, якія распісвалі яе сцены [1, с. 50]. У хуткім часе быў выдадзены указ аб фіксацыі помнікаў старажытнай гісторыі. Аднак указ не ўключаў правядзення на помніках рамонтных работ. На запыты губернатараў, што рабіць з дадзенымі аб’ектамі, цар адказваў: “Разрушать их не должно, но и чинить ненужного ненадобно, а поддерживать одни ворота или такие здания, в которых есть нужные помещения” [1, с. 50]. У 20–30-я гг. ХІХ ст. некалькі разоў паўтараліся загады аб выяўленні і падачы неабходных звестак аб помніках дойлідства.

Першай арганізацыяй, якая разглядала пытанне захавання архітэктурных каштоўнасцей, быў *Будаўнічы камітэт,* які дзейнічаў у 30-я гг. ХІХ ст. Напрыклад, указанне Мікалая І аб тым, каб вырашыць пытанне вялікага рамонта царквы Спаса ў Полацку, накіроўвалася менавіта ў гэты камітэт [1, с. 54]. Рамонтныя працы вяліся ў храме Спаса непрацяглы перыяд. Архітэктар Порт, які кіраваў імі, не зразумеў сутнасці помніка. У выніку быў страчаны першапачатковы мастацкі воблік храма (хоць даныя цалкам збераглісця) [1, с. 55].

Толькі з другой паловы ХІХ ст. у Расійскай імперыі пашыраецца працэс аховы помнікаў архітэктуры, у тым ліку і на беларускіх землях.

Важным пытаннем з’яўляецца вызначэнне тых арганізацый і дзяржаўных устаноў, ад якіх непасрэдна залежала ахова архітэктурных помнікаў. Гэта розныя таварыствы, камісіі, саюзы, камітэты і інш. Па падліках даследчыцы І. Камаровай, у Расійскай імперыі налічвалася каля 400 навуковых таварыстваў і арганізацый па вывучэнні археалогіі, гісторыі, архітэктуры [5, с. 49].

Самымі буйнымі арганізацыямі ў справе аховы помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны былі Пецярбургская імператарская археалагічная камісія, Расійская акадэмія мастацтваў, Маскоўскае імператарскае археалагічнае таварыства, Рускае геаграфічнае таварыства.

Адной з важных арганізацый, якая даследавала помнікі архітэктуры і ўзнімала пытанне іх належнага захавання, было *Рускае геаграфічнае таварыства,* створанае ў 1845 г. “Ведаць сваю айчыну ва ўсіх яе межах”, – такі быў дэвіз таварыства. У 1867 г. у таварыстве ствараецца Паўночна-заходні аддзел, які шмат зрабіў па вывучэнні помнікаў Беларусі [8, с. 7].

Аднак найбольш значны ўнёсак у справу аховы помнікаў архітэктуры зрабіла *Пецярбургская імператарская археалагічная камісія,* якая была створана ў 1850 г. Спачатку камісія займалася праблемамі выяўлення і стану захавання помнікаў археалогіі і архітэктуры. Паводле імператарскага ўказа ад 11 сакавіка 1889 г. ёй разам з Расійскай акадэміяй мастацтваў надаецца права весці справы па рэстаўрацыі манументальных старажытных помнікаў Расіі. З 1891 г. пачаліся пасяджэнні Пецярбургскай імператарскай археалагічнай камісіі па разглядзе рэстаўрацыйных і кансервацыйных спраў. Пасяджэнні камісіі не вылучаліся інтэнсіўнасцю. Колькасць разгледжаных спраў нават у найбольш плённыя гады не перавышала адной сотні, і тычыліся яны, як правіла, будынкаў праваслаўных цэркваў. Геаграфічна поле дзейнасці камісіі абмяжоўвалася выключна цэнтрам і паўночнымі рэгіёнамі Расійскай імперыі [8, с. 29].

На тэрыторыі Беларусі Пецярбургская імператарская археалагічная камісія займалася Каложскай царквой у Гродне і Белай вежай у Камянцы. Свята-Барыса-Глебская (Каложская) царква ў Гродне была часткова разбурана ў 1853–59 гг. у выніку апоўзняў. У сярэдзіне ХІХ ст. абваліліся частка заходняй сцяны і скляпенні. У 1872–73 гг. царква была рэканструявана, але зноў часткова абвалілася ў 1889 г. І, нарэшце, царква з’явілася першым помнікам на тэрыторыі Беларусі, пытанне пра захаванне якога разглядалася Імператарскай археалагічнай камісіяй у 1896 г. [7].

Яшчэ адным значным помнікам, на якім вяліся работы, была вежа ў Камянцы. У дакументах камісіі вежа фігуруе пад назвай Белая. Пытанне аб яе кансервацыі абмяркоўвалася ў 1898 і 1902 гг. [11, с. 29]. Па меркаванні навукоўца А. Самусіка,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэстаўрацыя Белай вежы займае адно з цэнтральных месцаў ў аднаўленні помнікаў беларускай архітэктуры ў дарэвалюцыйны перыяд [14, с. 15].

У канцы XIX ст. у Лідзе мясцовае насельніцтва пачало разбіраць замкавыя муры і пускаць матэрыялы на продаж. Аднак пасля пратэстаў мясцовых аматараў даўніны гэты вандалізм удалося спыніць.

У пачатку XX ст. Імператарская археалагічная камісія выдзеліла 946 руб. (для параўнання, у гэты час 50 кап. каштаваў пуд жыта) на правядзенне работ па кансервацыі Лідскага замка, але зроблена было няшмат: замак часткова абмерылі, зафатаграфавалі і разабралі ненадзейныя месцы муроўкі [16, с. 31]. Імператарская археалагічная камісія ў 1905–1907-м гг. неаднаразова праводзіла пасяджэнні па абмеркаванні стану Лідскага замка [11, с. 29]. Працы па цэласнай кансервацыі старажытнага замка правялі толькі ў 20–30-я гг. XX ст. польскія архітэктары.

Варта адзначыць, што ў Пецярбургу, акрамя Імператарскай археалагічнай камісіі, былі створаны ў розны час іншыя аб’яднанні, якія займаліся вывучэннем і аховай помнікаў Расійскай імперыі. Гэта Таварыства абароны і захавання помнікаў мастацтва і старажытнасці, Таварыства архітэктараў-мастакоў, Рускае вайскова-гістарычнае таварыства і інш. Асноўная іх заслуга – у далейшай распрацоўцы паняцця “помнік архітэктуры” [5, с. 53].

Працавала Пецярбургская імператарская археалагічная камісія ў цеснай сувязі з *Маскоўскім імператарскім археалагічным таварыствам,* якое было створана ў 1864 г. Мэта таварыства не была прапісана ў статуце, але знайшла сваё адлюстраванне ў дзейнасці. Яна фармулявалася такім чынам: “...координация всех научных сил, а также содействование развитию провинциальных обществ” [5, с. 49]. Па ініцыятыве дадзенага таварыства сумесна з Імператарскай археалагічнай камісіяй і Рускім геаграфічным таварыствам была зроблена першая спроба сабраць звесткі аб рускіх старажытных помніках. У гэтых мэтах археалагічнае таварыства падрыхтавала спецыяльны апытальнік (12 раздзелаў, якія ўключалі 156 параграфаў). Апытальнік змяшчаў методыку вызначэння паняцця “помнік” і апісанне помнікаў археалогіі [11, с. 28].

Праблему захавання праваслаўных царкоўных помнікаў вырашаў *Сінод рускай праваслаўнай царквы.* У 1870-я гг. Сінод накіраваў указанне ўсім епархіям Расіі адносна рамонту гістарычных будынкаў цэркваў, забароны перабудовы і знішчэння ў іх старадаўніх роспісаў [11, с. 29]. У 1904 г. пры Сінодзе створана спецыяльная камісія па рэстаўрацыі Каложскай царквы ў г. Гродна; у 1914 г. архітэктар камісіі П. П. Пакрышкін падаў у камісію Сінода праект рэстаўрацыі храма, але першая сусветная вайна не дала магчымасці рэалізаваць гэты праект. Дарэчы, па меркаванні даследчыка па ахове архітэктурнай спадчыны Беларусі Л. М. Несцерчука, менавіта П. П. Пакрышкін ажыццяўляў па сутнасці кантроль за станам дзейнасці па ахове помнікаў архітэктуры ва ўсёй імперыі [11, с. 30].

Пераважна пытаннямі вывучэння і захавання беларускай спадчыны займалася *Віцебская вучоная архіўная камісія,* якая была створана ў 1909 г. Яна аб’яднала вакол сябе такіх навукоўцаў, як Е. Р. Раманаў, А. П. Сапуноў, Д. І. Даўгяла, У. К. Стукаліч, К. І. Ціхаміраў, В. С. Арсеннеў і інш. [3, с. 459]. Камісія мела на мэце ахову помнікаў гісторыі і культуры, папулярызацыю гісторыі роднага краю, збор прадметаў старажытнасці. Абураная непрафесійнай рэстаўрацыяй цэркваў Барысаглебскага зарэчча і Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, Віцебская вучоная архіўная камісія звяртаецца ў Імператарскую археалагічную камісію, якая камандзіруе ў Полацк акадэміка архітэктуры П. П. Пакрышкіна. Полацкі і Віцебскі епіскап у 1908 г. хадайнічае перад Сінодам аб рамонце Сафійскага сабора. Аднак рамонт ажыццяўляецца толькі ў 1913 – 1914 гг. Разам з тым агрэсіўныя адносіны да спадчыны каталіцкага будаўніцтва вядуць да поўнага разбурэння другога, не менш значнага архітэктурнага шэдэўра горада Полацка – езуіцкага калегіума [6]. Будынак езуіцкага калегіума быў прыстасаваны пад кадэцкі корпус, а мураваны касцёл пераўтвораны ў Мікалаеўскі кафедральны сабор і абсталяваны магутнымі – галоўным і двума бакавымі – іканастасамі [6].

Падобная камісія існавала і ў Смаленску. *Смаленская вучоная архіўная камісія* выдавала “Смоленскую старину” і ўзнімала пытанні належнай аховы помнікаў [3, с. 459].

Вялася *дзейнасць і гарадскіх улад у справе аховы архітэктурных помнікаў Беларусі.* У гэтым сэнсе вызначаецца Навагрудак, горад са значнымі архітэктурнымі адметнасцямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Так, напрыклад, “Новогрудская Городская Дума, въ засѣданіи 5-го Декабря 1883 г., постановила слѣдующія опредѣленія ... Поручить Городской Управѣ не пріостанавливаться постройкою крыши на Подомениканскомъ городскомъ зданіи по случаю зимняго времени и возвратить Плонскому 1 р. 50 к.; израсходованные имъ при поѣздкѣ для покупки гонта, изъ суммъ, предположенныхъ на ремонтъ сего зданія” [4, с. 3]. А ў 1884 г. горад Навагрудак затраціў 700 рублёў “на ремонтъ обгорѣвшаго Поеізуитскаго городскаго зданія” [13, с. 5].

Важнае значэнне мясцовыя ўлады надавалі ахове гарадоў Беларусі ад пажараў. Ахова гарадской і культавай архітэктуры сталася паўсядзённай праблемай на працягу ўсяго XIX і пачатку XX ст. Вялікая колькасць пажараў была абумоўлена перавагай драўлянай забудовы гарадоў. Толькі адна Вільня ў 20–30-я. гг. XIX ст. мела прыкладна роўную колькасць мураваных і драўляных будынкаў. Шмат да нас дайшло сведчанняў пра пажары ў беларускіх гарадах. Напрыклад, у 1837 і 1848 гг. моцна пацярпеў Полацк. Пажар 1837 г. закрануў больш за 300 дамоў. У 1848 г. згарэлі 72 дамы. Горад яшчэ доўга пасля гэтага аднаўляўся [2, с. 108].

Як жа рэагавалі мясцовыя ўлады на такую вялікую колькасць пажараў, падчас якіх страчваліся унікальныя рысы нацыянальнай беларускай архітэктуры? У канцы XIX ст. ужо існавалі спецыяльныя пажарныя каманды, якія па трывозе выязджалі на месцы здарэння [10, с. 3]. Акрамя таго, ад пажараў рабіліся і іншыя спробы выратавання гарадоў. Так, у 1884 г. былі прыняты “обязательныя постановленія, ізданныя Рѣчицкою Городскою Думою... для жителей г. Рѣчицы”. Лічылася неабходным “содержать ночныхъ сторожей”, якія павінны былі сачыць за пажарамі і крадзяжамі. Для гэтага горад неабходна было “раздѣлить на участки”. Чалавек, які прызначаўся на гэту пасаду, павінен быць “только лица мужскаго пола, не моложе 20 лѣтъ и не старѣе 60 лѣтъ”. “Если ночной сторожъ при исполненіи обязанностей службы замѣтитъ гдѣ либо дымъ или вообще что либо, дающее поводъ опасаться пожара, то, удостовѣрившись въ этомъ лично и убѣдившись въ основательности своихъ опасеній, долженъ немедленно объявить объ этомъ живущему въ домѣ, которому угрожаетъ опасность, и единовременно чрезъ сосѣдняго сторожа извѣстить Полицію”. “Ночные сторожа обязаны имѣть трещотки и свистки для сигналовъ и для призыва на помощь сосѣднихъ своихъ товарищей и Полицію” [12, с. 1–2]. На жаль, сродкі аховы гарадоў ад пажараў не прыносілі жаданага поспеху.

Такім чынам, мы бачым, што ахова помнікаў архітэктуры Беларусі не мела належнага ўзроўню. Помнікі замест аднаўлення ў працэсе перабудовы часта страчвалі свае ўласцівыя рысы (напрыклад, храм Спаса ў Полацку і інш.). Толькі ў канцы XIX ст. працай па ахове з адносным поспехам пачала займацца Пецярбургская імператарская археалагічная камісія.

Пра нізкі ўзровень заклапочанасці дзяржавы ў справе аховы помнікаў сведчыць даследчык XIX ст. А. М. Семянтоўскі: “...большинство нашего такъ называемаго образованнаго класса очень равнодушно... къ сбереженію самыхъ памятниковъ старины... Этотъ упрекъ мы смѣло можемъ сдѣлать многимъ учрежденіям, не говоря уже о полицейскомъ вѣдомствѣ, на глазахъ котораго нерѣдко просто разрушаются остатки древностей. Часто безъ слѣдно гибнутъ памятники старины, хранящіеся въ нашихъ церквахъ и монастыряхъ...” [15, с. 3]

Навукоўцы, якія вывучаюць праблему аховы архітэктурнай спадчыны на тэрыторыі Расійскай імперыі, адзначаюць адсутнасць заканадаўчай базы, што адмоўна ўплывала на належнае вырашэнне пытанняў захавання помнікаў. Не прадугледжвалася адказнасць за разбурэнне помнікаў архітэктуры, не было вызначана дакладнае паняцце “помнік”. Праект закона аб ахове помнікаў, які быў распрацаваны на Другім археалагічным з’ездзе (1871), не быў прыняты ў Расійскай імперыі, хаця пытанне такое выносілася на абмеркаванне ў Дзяржаўнай Думе [9, с. 175]. Больш спроб увесці заканадаўчую базу па праблеме аховы культурнай спадчыны ў Расійскай імперыі не рабілася.

Такім чынам, можна падвесці наступныя вынікі.

У Расійскай імперыі былі вызначаны тыя арганізацыя і ўстановы, якія адказвалі за захаванне архітэктурных помнікаў. У першай палове XIX ст. гэта Будаўнічы камітэт, а ў другой палове XIX ст. – Расійская акадэмія мастацтваў і Пецярбургская археалагічная камісія. Станоўчым вынікам дзейнасці археалагічных таварыстваў з’явілася падпісанне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

імператарскага загаду аб забароне перарабляць старажытныя збудаванні без дазволу гэтых таварыстваў (1877) [11, с. 29].

Праца па рэстаўрацыі культавых будынкаў павінна была адбывацца толькі з дазволу Сінода, які ствараў спецыяльныя камісіі. Аднак канкрэтная праца па наглядзе за старажытнымі помнікамі ўскладалася на паліцэйскае ведамства, якое не магло забяспечыць прафесійнага падыходу да гэтай справы і выконвала яе часта фармальна.

Мясцовыя ўлады шмат увагі надавалі барацьбе з пажарамі, падчас якіх гарэлі помнікі гарадской і культавай архітэктуры.

Дзяржаўныя ўстановы Расійскай імперыі і створаныя таварыствы, займаючыся аховай помнікаў, больш клопату праяўлялі ў дачыненні да праваслаўных храмаў і аб'ектаў, якія ў адпаведнасці з ідэалагічнымі пазіцыямі самадзяржаўя сімвалізавалі агульнае паходжанне рускіх і беларусаў.

У Расійскай імперыі да рэвалюцыі 1917 г. не было заканадаўчай базы па ахове помнікаў, што значна ўскладняла праблему належнага захавання архітэктурнай спадчыны. Не было дакладнага ўяўлення, што належыць ахоўваць, не прадугледжвалася адказнасць за разбурэнне і пашкоджанне помнікаў. Але, нягледзячы на гэта, станоўчым з'яўляецца тое, што справе аховы помнікаў архітэктуры надавалася пэўная ўвага.


1. *Алексеев, Л. В.* Археология и краеведение Беларуси XVI в., 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев – Мн.: Беларуская навука, 1996. – 206 с.

2. *Безъ-Корнилович, М. О.* Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии / М. О. Безъ-Корнилович. – СПб.: Типографія III отд. собст. Е. И. В. Канцеляріи, 1855. – 355 с.

3. *Довнар-Запольский, М. В.* История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. – Мн.: Беларусь, 2003. – 680 с.

4. *Засѣданіе* Новогрудской Городской Думы // Минскія вѣдомости. – 1884. – 4 февр.

5. *Комарова, И. И.* Историко-археологические организации и реставрационная методика в середине XIX – начале XX в. / И. И. Комарова // История и теория реставрации памятников архитектуры: сб. науч. трудов / под ред. А. С. Щенкова. – М.: Центральный научно-исследовательский и проектный институт по градостроительству, 1986. – С. 48–55.

6. *Кулагін, А. М.* Храмы на Дзвіне / А. М. Кулагін // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 1. – С. 51 – 58.

7. *Кулагін, А. М.* Свята-Барыса-Глебская (Каложская) царква ў Гродна / А. М. Кулагін // Праваслаўныя храмы на Беларусі: энцыклапедычны даведнік. – Мн.: БелЭн, 2001. – С. 62.

8. *Лакотка, А. І.* Сцежкамі дзядоў / А. І. Лакотка, С. В. Барыс – Мн.: Народная асвета, 1986. – 174 с.

9. *Локотко, А. И.* Архитектурное наследие Беларуси: развитие традиций, охрана и реставрация / А. И. Локотко. – Мн.: Право и экономика, 2004. – 304 с.

10. *Мѣстныя* извѣстія // Витебскія губернскія вѣдомости. – 1894. – 15 мая.

11. *Несцярчук, Л. М.* Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы / Л. М. Несцярчук. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – 286 с.

12. *Обязательныя* постановленія, изданныя Рѣчіцкою Городскою Думою // Минскія вѣдомости. – 1884. – 7 іюля.

13. *Роспись* доходовъ и расходовъ города Новогрудка за 1884 годъ // Минскія вѣдомости. – 1884. – 23 іюня.

14. *Самусік, А. Ф.* Помнікі гісторыі і культуры Беларусі / А. Ф. Самусік. – Мн.: БДЭУ, 2004. – 209 с.

15. *Сементовский, А. М.* Бѣлорусскія древности / А. М. Сементовскій. – СПб., 1890. – 136 с.

16. *Ткачоў, М. А.* Замкі Беларусі / М. А. Ткачоў. – Мн.: Полымя, 1977. – 82 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ